Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка"

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар
____________________ А.І.Жук
____________________ 2024 г.

Рэгістрацыйны № УД 31-2-101 / вуч.

**РЫТОРЫКА І КУЛЬТУРА БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ**

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:

**6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура)**

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту агульнай вышэйшай адукацыі зацверджанага 02.08.2023, рэг. № 225, вучэбнага плана спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура), зацверджанага 23.02.2023, рэг. № 048 – 2023/у

**СКЛАДАЛЬНІКІ**:
Н.П.Лобань, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
В.М.Лухверчык, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
М.І.Свістунова, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
А.П.Жыганава, дацэнт кафедры беларускай і зарубежнай літаратуры УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка», кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**
Дырэктар дзяржаўнай установы адукацыі
«Гімназія № 18 г. Мінска імя І.С.Міранкова» ____________ Ю.В.Новік

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(пратакол № 11 ад 20.06.2024 г.)

Загадчык кафедры ____________ Д.В.Дзятко

Навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(пратакол № 9 ад 16.07.2024 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага
аддзела ____________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ____________ Н.П.Сяткоўская

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Рыторыка і культура беларускага маўлення” прадугледжана адукацыйным стандартам і вучэбным планам падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці 6-05-0113-02 “Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура)”. Вучэбная праграма па дысцыпліне “Рыторыка і культура беларускага маўлення” прызначана для рэалізацыі на першай ступені вышэйшай адукацыі ў межах цыкла спецыяльных дысцыплін і займае сярод іх важнае месца. Курс знаёміць студэнтаў з матэрыялам па тэорыі і гісторыі красамоўства. Ён прадугледжвае вывучэнне класічнай, традыцыйнай рыторыкі, якая бярэ пачатак са Старажытнай Грэцыі і Старажытнага Рыма, а таксама знаёмства з апошнімі дасягненнямі неарыторыкі, што даследуе праблемы камунікатыўнай характарыстыкі маўленчай дзейнасці, канструявання розных відаў тэксту, паўнацэннага ўспрыняцця маўлення, наладжванне адваротнай сувязі паміж слухачамі і прамоўцам і інш.

**Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны.**

*Мэта вучэбнай дысцыпліны* – даць студэнтам тэарэтычныя і практычныя веды аб рыторыцы як спосабе маўленчага ўздзеяння, садзейнічаць павышэнню маўленчай культуры, выпрацаваць і замацаваць практычныя ўменні і навыкі граматнага карыстання вуснай і пісьмовай мовай.

*Задачы вучэбнай дысцыпліны:*

– вывучыць рыторыку і культуру беларускага маўлення як навуку аб маўленчых зносінах, прывіць навыкі рытарычнай практыкі;

– навучыць правільнаму і дзейснаму спосабу выкладання думак, паказаць магчымасці развіцця думкі, накіраванай на розныя сферы навакольнага свету;

– павысіць маўленчую культуру студэнтаў шляхам азнаямлення з сачыненнямі найлепшых выступоўцаў як лепшымі ўзорамі красамоўства і тым самым узбагаціць іх маўленне думкамі, словамі і сродкамі выразнасці вялікіх папярэднікаў.

**Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй.**

Вучэбная дысцыпліна “Рыторыка і культура беларускага маўлення” з’яўляецца дысцыплінай модуля “Прыкладная лінгвістыка” кампанента ўстановы адукацыі. Дадзеная вучэбная дысцыпліна займае вядучае месца ў сістэме маўленчай падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай філалагічнай адукацыяй.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі.*

Вучэбная дысцыпліна «Рыторыка і культура беларускага маўлення» цесна звязана з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як «Фанетыка-лексіка-словаўтварэнне», «Марфалогія», «Сінтаксіс», «Культура маўлення педагога», «Стылістыка», «Тэкст. Чужое маўленне. Пунктуацыя».

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

***ведаць***:

– гісторыю станаўлення і развіцця красамоўства і культуры маўлення;

– асаблівасці вуснага публічнага маўлення;

– асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення і моўныя нормы;
– асноўныя паняцці і катэгорыі рыторыкі;
– лагічныя асновы пабудовы маўлення;
– тэхнічныя характарыстыкі маўлення.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

***умець*:**

– прытрымлівацца нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы;
– выбіраць і арганізоўваць выкарыстанне моўных сродкаў у адпаведнасці з маўленчай сітуацыяй і этыкай зносін;
– рабіць аналіз тэкстаў (вусных паведамленняў) розных стыляў, жанраў, формаў;
– рашаць лінгвістычныя задачы і тэсты, што служаць замацаванню вучэбнага матэрыялу;
– правільна разважаць на аснове дэдукцыі, фармуляваць тэзу, антытэзу, пытанні і адказы па тэксце, падбіраць розныя тыпы аргументаў;
– прадуктыўна праводзіць дзелавыя гутаркі, абгрунтоўваць, пераконваць, прафесійна адстойваць у дыскусіях уласны пункт гледжання.;
– развіваць уласны стыль маўлення, ствараць розныя тыпы тэкстаў па правілах аратарскага мастацтва.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен

***валодаць***:

– мастацтвам публічнага выступлення, тэхнікай гаворкі;
– культурай вуснага і пісьмовага маўлення;
– нормамі літаратурнай мовы;
– літаратурным вымаўленнем;
– прымяняць адпаведныя моўныя функцыі і іх спалучэнні, камунікатыўныя стратэгіі і тактыкі з мэтай эфектыўных зносін у любых сітуацыях;
– уменнем выкарыстання маўленчых мадэляў і маўленчага этыкету ў кантэксце міжкультурных камунікацый.

**Патрабаванні да кампетэнцый.**

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Рыторыка і культура беларускага маўлення» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў спецыялізаванай кампетэнцыі **СК-9**: Выкарыстоўваць пры стварэнні вусных і пісьмовых тэкстаў камунікатыўныя стратэгіі і тактыкі як мэтанакіраваны від дзейнасці.

Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Рыторыка і культура беларускага маўлення” адведзена для вочнай (дзённай) формы атрымання вышэйшай адукацыі 108 гадзін, з іх 56 аўдыторных гадзін. Размеркаванне гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 28 гадзін, практычныя заняткі – 28 гадзін, самастойная работа – 44 гадзіны.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

Прамежкавая атэстацыя праводзіцца ў адпаведнасці з вучэбным планам па спецыяльнасці ў форме заліку ў 3 семестры.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## 1. УВОДЗІНЫ

Прадмет і задачы курса, яго месца ў сістэме лінгвістычных дысцыплін і гуманітарнай адукацыі.

Рыторыка як мастацтва і яе значэнне ў жыцці чалавека.

Вызначэнне, прадмет і задачы рыторыкі. Сувязь рыторыкі з іншымі навукамі.

Асноўныя тэрміны і паняцці курса.

## 2. РЫТОРЫКА Ў КАНТЭКСЦЕ РОЗНЫХ ГІСТАРЫЧНЫХ ЭПОХ

Прамоўніцкае мастацтва старажытнай Грэцыі. Красамоўства ў старажытным Рыме. Развіццё рыторыкі ў сярэднія стагоддзі.

Тэорыі антычнай рыторыкі.

Прамоўніцкае мастацтва эпохі Адраджэння і новага часу. Рытарычная думка ва ўсходнеславянскай культуры XVII–XVII стст.

Рыторыка ў Беларусі. Рытарычная дзейнасць лепшых прамоўцаў Беларусі.

## 3. АСНОВЫ МАСТАЦТВА ПРАМОВЫ

Спецыфіка вуснага публічнага выступлення. Віды публічных выступленняў. Асаблівасці публічнага выступлення. Рытарычныя законы.

Працэс падрыхтоўкі публічнага выступлення. Рытарычная дзейнасць на этапе падрыхтоўкі прамовы. Тэма выступлення. Мэтавая ўстаноўка маўлення. Адбор і сістэматызацыя матэрыялу.

Паняцце «топас». Сэнсавыя мадэлі выказвання.

Узаемадзеянне вуснай і пісьмовай форм мовы пры напісанні аратарскага выступлення.

Працэс падрыхтоўкі публічнага выступлення. Рытарычная дзейнасць на этапе размяшчэння матэрыялу. Віды ўступаў і заключэнняў, прыёмы іх канструявання.

Спосабы разгортвання асноўнай часткі прамовы.

Культура палемічнай мовы і моўныя сродкі аратара. Падбор альтэрнатыўных, уводных слоў і выразаў. Размежаванне матываваных і нематываваных паўтораў, складанне слоўніка сінонімаў, эпітэтаў.

Рытарычная дзейнасць на этапе слоўнага афармлення выступлення. Тактыкі маўленчага ўздзеяння.

Рытарычная дзейнасць на этапе запамінання. Прыёмы запамінання інфармацыі.

Прафесійнае майстэрства аратара. Выступленне з прамовай. Узаемадзеянне аратара з аўдыторыяй.

Прафілактыка «аратарскага шоку».

Рытарычнае пытанне. Віды пабудовы сказаў (інверсія, градацыя, паралелізм, паўтор, перыяд). Выкарыстанне прыказак, прымавак, крылатых выразаў.

Тропы і фігуры маўлення.

Паняцце «тэхнікі маўлення». Інтанацыя. Голас. Дыкцыя.

Маўленчае (фанацыйнае) і фізіялагічнае дыханне.

Невербальныя сродкі ў маўленні. Паняцце кінэсікі, такесікі, праксемікі.

Маўленчы этыкет.

Нацыянальная спецыфіка невербальнай камунікацыі. Імідж.

Паняцце аб маўленчым уздзеянні. Маўленчае маніпуляванне. Кагнітыўныя механізмы маўленчага уздзеяння. Камунікатыўныя стратэгіі і іх рэалізацыя ў маўленні.

Зрокавы аспект выступлення. Знешні від аратара. Размяшчэнне ў аўдыторыі. Погляд.

## 4. СПЕЦЫФІКА ПУБЛІЧНЫХ ПРАМОЎ РОЗНЫХ ТЫПАЎ

Камунікатыўныя якасці маўлення як умова эфектыўных зносін. Інфармацыйная прамова.

Пераконваючая прамова. Кампазіцыя і жанры маўленчых твораў.

Рэкламная прамова. Правілы падрыхтоўкі рэкламнай прамовы.

Маналагічнае і дыялагічнае маўленне. Дыскусійная маўленне.

Прамова, заклікаючая да дзеяння. Лагічныя прыёмы. Доказ і перакананне.

Натхняльная прамова. Ваенна-патрыятычныя выступленні, віншавальныя і прывітальныя прамовы.

Забаўляльная прамова. Давяральная прамова.

Камунікатыўная рыторыка. Функцыі камунікацыі. Камунікатыўная кампетэнтнасць. Тыпы суразмоўцаў.

Эфектыўнасць публічнай прамовы. Эфектыўнасць публічнай прамовы ў розных аўдыторыях. Ацэнка эфектыўнасці публічнай прамовы.

## 5. СКЛАД І СТРУКТУРА АРГУМЕНТАЦЫЙНАГА МАЎЛЕННЯ

Фактары пераконваючага ўздзеяння. Аргументацыя: мэты, структура і яе віды.

Суб’ект і аб’ект аргументацыі. Фактары, якія вызначаюць пераканаўчасць маўлення.

Тэза. Антытэза. Тыпы аргументацыйных прамоў. Класічная канцэпцыя працэсу пераканання.

Абвяржэнне аргументацыі. Нагнятанне аргументаў. Метад Сакрата.

Тыпы аргументацыйных прамоў па іх пабудове. Доказ і перакананне.

З гісторыі мастацтва спрэчкі.

Структура спрэчкі. Віды спрэчак па мэтах і сродках.

Дыспут. Правілы правядзення арганізаванага дыспуту. Палеміка.

## 6. ПЫТАЛЬНА-ЗВАРОТНЫЯ ДЫЯЛОГІ І ІХ РОЛЯ Ў АРГУМЕНТАЦЫІ

Функцыі пытанняў у аргументацыі. Структура пытанняў.

Віды пытанняў. Паняцце карэктнасці пытанняў.

Мастацтва адказваць на пытанні. Віды адказаў.

**Вучэбна-метадычная карта вучэбнай дысцыпліны «Рыторыка і культура беларускага маўлення»**
**дзённая форма атрымання адукацыі**

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы, пытанні па тэме | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная работа | Метадычныя дапаможнікі, сродкі навучання | Літаратура | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | | | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 |
| | **РЫТОРЫКА І КУЛЬТУРА БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ** | **28** | **28** | **52** | | | |
| **1** | **Уводзіны** | **2** | | | | | |
| | Прадмет і задачы курса, яго месца ў сістэме лінгвістычных дысцыплін і гуманітарнай адукацыі.<br>Рыторыка як мастацтва і яе значэнне ў жыцці чалавека.<br>Вызначэнне, прадмет і задачы рыторыкі. Сувязь рыторыкі з іншымі навукамі. Асноўныя тэрміны і паняцці курса. | 2 | | | Камп’ютарная прэзэнтацыя | 1-3,<br>1-6 | |
| **2** | **Рыторыка ў кантэксце розных гістарычных эпох** | **2** | **4** | **8** | | | |
| | Прамоўніцкае мастацтва старажытнай Грэцыі.<br>Красамоўства ў старажытным Рыме.<br>Развіццё рыторыкі ў сярэднія стагоддзі. | 2 | | 2 | Камп’ютарная прэзэнтацыя, раздатачны матэрыял | 3,<br>1-6 | Праверка рэфератаў |
| | Тэорыі антычнай рыторыкі. | | | 2 | | | Праверка прэзэнтацый |
| | Прамоўніцкае мастацтва эпохі Адраджэння і новага часу.<br>Рытарычная думка ва ўсходнеславянскай культуры XVII–XVII стст. | | 2 | 2 | Раздатачны матэрыял | 3,<br>1-6 | Праверка канспектаў, франтальнае апытванне |
| | Рыторыка ў Беларусі. | | 2 | | Раздатачны матэрыял, відэа- і аўдыёматэрыялы | 3,<br>1-6 | Праверка пісьмовых заданняў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Рытарычная дзейнасць лепшых прамоўцаў Беларусі. | | | 2 | | 3, 1-6 | Праверка рэфератаў |
| **3** | **Асновы мастацтва прамовы** | **10** | **10** | **26** | | | |
| | Спецыфіка вуснага публічнага выступлення. Віды публічных выступленняў. Асаблівасці публічнага выступлення. Рытарычныя законы. | 2 | | | Камп'ютарная прэзентацыя | 1-3, 1-6 | |
| | Працэс падрыхтоўкі публічнага выступлення. Рытарычная дзейнасць на этапе падрыхтоўкі прамовы. Тэма выступлення. Мэтавая ўстаноўка маўлення. Адбор і сістэматызацыя матэрыялу. | 2 | | | Камп'ютарная прэзентацыя | 3, 1-6 | |
| | Паняцце «топас». Сэнсавыя мадэлі выказвання. | | | 2 | | 1-6 | Праверка канспектаў |
| | Узаемадзеянне вуснай і пісьмовай форм мовы пры напісанні аратарскага выступлення. | | | 2 | | 1-6 | Праверка канспектаў |
| | Працэс падрыхтоўкі публічнага выступлення. Рытарычная дзейнасць на этапе размяшчэння матэрыялу. Віды ўступаў і заключэнняў, прыёмы іх канструявання. | | 2 | | Раздатачны матэрыял | 1-3, 1-6 | Праверка заданняў па тэме |
| | Спосабы разгортвання асноўнай часткі прамовы. | | 2 | | Раздатачны матэрыял | 1-6 | Праверка пісьмовых заданняў |
| | Культура палемічнай мовы і моўныя сродкі аратара. Падбор альтэрнатыўных, уводных слоў і выразаў. Размежаванне матываваных і нематываваных паўтораў, складанне слоўніка сінонімаў, эпітэтаў. | | | 4 | | 1-3, 1-6 | Праверка рэфератаў і прэзентацый |
| | Рытарычная дзейнасць на этапе слоўнага афармлення выступлення. Тактыкі маўленчага ўздзеяння. | | 2 | | Відэа- і аўдыёматэрыялы | 3, 1-6 | |
| | Рытарычная дзейнасць на этапе запамінання. Прыёмы запамінання інфармацыі. | 2 | | | Камп'ютарная прэзентацыя | 1-6 | |
| | Прафесійнае майстэрства аратара. Выступленне з прамовай. Узаемадзеянне аратара з аўдыторыяй. | 2 | | | Камп'ютарная прэзентацыя | 1-6 | |
| | Прафілактыка «аратарскага шоку». | | | 2 | | 1-6 | Праверка дакладаў |
| | Рытарычнае пытанне. Віды пабудовы сказаў (інверсія, градацыя, паралелізм, паўтор, перыяд). Выкарыстанне прыказак, прымавак, крылатых выразаў. | | | 4 | | 1-6 | Праверка прамоў |
| | Тропы і фігуры маўлення. | | | 2 | | | Франтальнае |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | | апытванне, праверка канспектаў |
| | Паняцце «тэхнікі маўлення». Інтанацыя. Голас. Дыкцыя. | | 2 | | Відэа- і аўдыёматэрыялы | 1,2, 1-6 | Франтальнае апытванне |
| | Маўленчае (фанацыйнае) і фізіялагічнае дыханне. | | | 2 | | 1,2, 1-6 | Франтальнае апытванне, праверка канспектаў |
| | Невербальныя сродкі ў маўленні. Паняцце кінэсікі, такесікі, праксемікі. | | 2 | | Раздатачны матэрыял | 1,2, 1-6 | Тэст |
| | Маўленчы этыкет. | | | 2 | | 1,2, 1-6 | Франтальнае апытванне, праверка канспектаў |
| | Нацыянальная спецыфіка невербальнай камунікацыі. Імідж. | | | 2 | | 1,2, 1-4 | Праверка канспектаў |
| | Паняцце аб маўленчым уздзеянні. Маўленчае маніпуляванне. Кагнітыўныя механізмы маўленчага уздзеяння. Камунікатыўныя стратэгіі і іх рэалізацыя ў маўленні. | 2 | | | Камп'ютарная прэзентацыя | 3, 1-6 | |
| | Зрокавы аспект выступлення. Знешні від аратара. Размяшчэнне ў аўдыторыі. Погляд. | | | 4 | | 1,2 1-6 | Праверка прамоў |
| **4** | **Спецыфіка публічных прамоў розных тыпаў** | **6** | **6** | **8** | | | |
| | Камунікатыўныя якасці маўлення як умова эфектыўных зносін. Інфармацыйная прамова. | 2 | | | Камп'ютарная прэзентацыя | 1-3 | |
| | Пераконваючая прамова. Кампазіцыя і жанры маўленчых твораў. | | 2 | | Відэа- і аўдыёматэрыялы, тэксты для аналізу | 1-6 | Праверка прамоў |
| | Рэкламная прамова. Правілы падрыхтоўкі рэкламнай прамовы. | | | 2 | | 1-6 | Праверка дакладаў |
| | Маналагічнае і дыялагічнае маўленне. Дыскусійная маўленне. | 2 | | | Камп'ютарная прэзентацыя | 1-6 | |
| | Прамова, заклікаючая да дзеяння. Лагічныя прыёмы. Доказ і перакананне. | | 2 | | Відэа- і аўдыёматэрыялы, тэксты для аналізу | 1-6 | Праверка прамоў |
| | Натхняльная прамова. Ваенна-патрыятычныя выступленні, віншавальныя і прывітальныя прамовы. | | 2 | | Відэа- і аўдыёматэрыялы, тэксты для аналізу | 1-6 | Праверка прамоў |

| | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | Забаўляльная прамова. Даяральная прамова. | 2 | | | Камп’ютарная прэзентацыя | 1-6 | |
| | Камунікатыўная рыторыка. Функцыі камунікацыі. Камунікатыўная кампетэнтнасць. Тыпы суразмоўцаў. | | | 4 | | 1-6 | Праверка рэфератаў і прэзентацый |
| | Эфектыўнасць публічнай прамовы. Эфектыўнасць публічнай прамовы ў розных аўдыторыях. Ацэнка эфектыўнасці публічнай прамовы. | | | 2 | | 1-6 | Праверка канспектаў |
| **5** | **Склад і структура аргументацыйнага маўлення** | **6** | **6** | **6** | | | |
| | Фактары пераконваючага ўздзеяння. Аргументацыя: мэты, структура і яе віды. | 2 | | | Камп’ютарная прэзентацыя | 1-6 | |
| | Суб’ект і аб’ект аргументацыі. Фактары, якія вызначаюць пераканаўчасць маўлення. | 2 | | | Камп’ютарная прэзентацыя | 1-6 | |
| | Тэза. Антытэза. Тыпы аргументацыйных прамоў. Класічная канцэпцыя працэсу пераканання. | | 2 | | Відэа- і аўдыёматэрыялы, тэксты для аналізу | 1-6 | Франтальнае апытванне |
| | Абвяржэнне аргументацыі. Нагнятанне аргументаў. Метад Сакрата. | | 2 | | Тэксты для аналізу | 1-6 | Праверка пісьмовых заданняў |
| | Тыпы аргументацыйных прамоў па іх пабудове. Доказ і перакананне. | | 2 | | Відэа- і аўдыёматэрыялы, тэксты для аналізу | 1-6 | Франтальнае апытванне |
| | З гісторыі мастацтва спрэчкі. | | | 2 | | | Праверка канспектаў |
| | Структура спрэчкі. Віды спрэчак па мэтах і сродках. | 2 | | | Камп’ютарная прэзентацыя | 1-6 | |
| | Дыспут. Правілы правядзення арганізаванага дыспуту. Палеміка. | | | 4 | | 1-6 | Праверка дыспуту, палемікі |
| **6** | **Пытальна-зваротныя дыялогі і іх роля ў аргументацыі.** | **2** | **2** | **4** | | | |
| | Функцыі пытанняў у аргументацыі. Структура пытанняў. | 2 | | | Камп’ютарная прэзентацыя | 1-6 | |
| | Віды пытанняў. Паняцце карэктнасці пытанняў. | | 2 | | Тэксты для аналізу | 1-6 | Франтальнае апытванне |
| | Мастацтва адказваць на пытанні. Віды адказаў. | | | 4 | | 1-6 | Праверка рэфератаў |
| | **Усяго: 108 г.** | **28** | **28** | **52** | | | **залік** |

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА

**Асноўная літаратура**

1. Культура маўлення педагога : інтэрактыўны электрон. вучэб.-метад. комплекс / склад. Н. П. Лобань // СДО Moodle / Беларус. дзярж. пед. ун-т. – URL: https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=7401 (дата звароту: 11.11.2024).
2. Культура маўлення : інтэрактыўны электрон. вучэб.-метад. комплекс / склад. Н. П. Лобань // СДО Moodle / Беларус. дзярж. пед. ун-т. – URL: https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2133 (дата звароту: 11.11.2024).
3. Станкевіч, А. А. Рыторыка : падручнік / А. А. Станкевіч. – Гомель : Гомел. дзярж. ун-т, 2016. – 282 с.

**Дадатковая літаратура**

1. Введенская, Л. А. Риторика и культура речи / Л. А. Введенская, Л. Г. Павлова. – Изд. 12-е, стер. – Ростов н/Д : Феникс, 2012. – 537 с.
2. Леванцэвіч, Л. В. Рыторыка : курс лекцый для студэнтаў спецыяльнасці 1-21 05 01-01 «Беларуская філалогія (рэдакцыйна-выдавецкая дзейнасць)» / Л. В. Леванцэвіч. – Брэст : Брэсц. дзярж. ун-т, 2020. – 154 с.
3. Риторика : практикум / сост.: И. П. Кудреватых, Ю. А. Гурская. – Минск : Белорус. гос. пед. ун-т, 2011. – 176 с.
4. Рыторыка : вучэб.-метад. комплекс па вучэб. дысцыпліне для філал. спецыяльнасцей / склад. Г. К. Семянькова. – Віцебск : Віцеб. дзярж. ун-т, 2017. – 104 с.
5. Савчук, Т. Н. Риторика : учеб.-метод. комплекс / Т. Н. Савчук. – Минск : Изд-во МИУ, 2005. – 176 с.
6. Станкевіч, А. А. Рыторыка : вучэб. дапам. / А. А. Станкевіч. – Мінск : Рэсп. ін-т выш. шк., 2010. – 316 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ (ПАЗААЎДЫТОРНАЙ) РАБОТЫ СТУДЭНТА ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

Адной з галоўных задач, якія стаяць перад вышэйшай школай, з'яўляецца павышэнне якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Будучы выпускнік павінен не толькі атрымліваць веды па прадметах, якія прадугледжаны вучэбнымі праграмамі, авалодваць уменнямі і навыкамі выкарыстання гэтых ведаў, метадамі даследчай работы, але і ўмець самастойна набыць новыя навуковыя звесткі.

Сістэматычна арганізаваная самастойная работа студэнтаў з'яўляецца асноўным сродкам падрыхтоўкі да самастойнай дзейнасці, а змест, метады і формы выступаюць у ролі фактараў, якія ўплываюць на даную падрыхтоўку.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў дзённага аддзялення накіравана на вырашэнне наступных задач:

– паўтарэнне, замацаванне і абагульненне раней атрыманых ведаў;

– удасканаленне прадметных навыкаў, фарміраванне даследчых уменняў і навыкаў;

– актывізацыя вучэбнай і навукова-даследчыцкай дзейнасці студэнтаў;

– фарміраванне гатоўнасці студэнтаў да самаадукацыі.

Крыніцай інфармацыі пры выкананні студэнтамі самастойнай работы могуць выступаць: канспект; друкаваныя матэрыялы; падручнікі і слоўнікі; матэрыялы на электронных носьбітах.

План самастойнай работы прадугледжвае: форму работы, змест (аб'ём) работы, тэрмін выканання, віды кантролю.

У залежнасці ад месца і часу правядзення самастойнай працы, характару кіраўніцтва ёю з боку выкладчыка і спосабу кантролю за яе вынікамі падзяляецца на наступныя віды:

– самастойную працу падчас асноўных аўдыторных заняткаў (лекцый, семінараў);

– самастойную працу пад кантролем выкладчыка ў форме планавых кансультацый, творчых кантактаў, залікаў і экзаменаў;

– пазааўдыторную самастойную працу пры выкананні студэнтамі дамашніх заданняў навучальнага і творчага характару.

Самастойнасць пералічаных вышэй відаў прац досыць умоўная, і ў рэальным адукацыйным працэсе гэтыя віды перасякаюцца адзін з адным.

Самастойная праца студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі дастаткова разнастайная, яна можа прадугледжваць:

– выкананне самастойных работ;

– выкананне кантрольных работ, складанне схем, табліц;

– працу з даведачнай, метадычнай і навуковай літаратурай па мовазнаўстве;

– абарону выкананых работ;

– падрыхтоўку да дыскусій, канферэнцый;

– падрыхтоўку да тэсціравання і інш.

Асноўныя віды заданняў для самастойнай працы:

– вывучэнне навуковых і вучэбных тэкстаў (падручнікі, першакрыніцы, дадатковая літаратура);

– складанне плана тэксту;

– графічнае адлюстраванне структуры тэксту;

– канспектаванне тэксту;

– праца са слоўнікамі, даведнікамі;

– азнаямленне з нарматыўнымі дакументамі;

– вучэбна-даследчыцкая дзейнасць;

– выкарыстанне аўдыя- і відэазапісаў.

Для замацавання і сістэматызацыі ведаў, набытых студэнтамі самастойна, выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– праца з канспектам лекцыі (апрацоўка тэксту), паўторная работа над вучэбным матэрыялам (з падручнікаў, першакрыніц, дадатковай літаратуры і інш.);

– складанне планаў і тэзісаў адказаў;

– складанне табліц для сістэматызацыі навучальнага матэрыялу;

– вывучэнне нарматыўных матэрыялаў;

– адказы на кантрольныя пытанні;

– падрыхтоўка паведамленняў да выступлення на семінары;

– падрыхтоўка рэфератаў, дакладаў.

Для фарміравання ўменняў выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– выкананне практыкаванняў па ўзоры;

– рашэнне варыянтных заданняў і практыкаванняў;

– рэфлексіўны аналіз прафесійных уменняў з выкарыстаннем аўдыя- і відэатэхнікі і інш.

Віды заданняў для самастойнай працы, іх змест і характар могуць мець варыятыўны і дыферэнцыяваны характар, улічваць спецыфіку матэрыялу, які выносіцца на самастойнае вывучэнне.

Сярод канкрэтных відаў самастойнай работы рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя:

а) самастойная работа па ўзоры (перанос вядомага спосабу ў аналагічную сітуацыю);

б) рэканструктыўна-варыятыўная самастойная работа (перанос вядомага спосабу з некаторай мадыфікацыяй у незнаёмую сітуацыю);

в) эўрыстычная самастойная работа (перанос вядомых спосабаў у нестандартную сітуацыю, дзякуючы чаму, самастойная работа набывае даследчы характар).

Для правядзення кантролю самастойнай працы студэнтаў выкарыстоўваюцца:

| № п/п | Назва АС | Кароткая характарыстыка ацэначнага сродку | Прадстаўленне АС у ВП |
|---|---|---|---|
| 1 | Рэферат | Прадукт самастойнай працы студэнта, які ўяўляе сабой кароткі выклад у пісьмовым выглядзе атрыманых | Тэмы рэфератаў адлюстраваны ў табліцы «Патрабаванні да выканання самастойнай працы |

| № п/п | Назва АС | Кароткая характарыстыка ацэначнага сродку | Прадстаўленне АС у ВП |
|---|---|---|---|
| | | вынікаў тэарэтычнага аналізу пэўнай навуковай (навучальна-даследчай) тэмы, дзе аўтар раскрывае сутнасць доследнай праблемы, прыводзіць розныя пункты гледжання, а таксама ўласны погляд на яе. | студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне»» і ў Прыкладнай тэматыцы дакладаў, рэфератаў і прэзентацый. |
| 2 | Даклад | Прадукт самастойнай працы студэнта, публічнае выступленне з прадстаўленнем атрыманых вынікаў рашэння пэўнай вучэбна-практычнай, вучэбна-даследчай або навуковай тэмы. | Тэмы дакладаў адлюстраваны ў табліцы «Патрабаванні да выканання самастойнай працы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне» і ў Прыкладнай тэматыцы дакладаў, рэфератаў і прэзентацый. |
| 3 | Мультымедыйная прэзентацыя | Прадстаўленне зместу вучэбнага матэрыялу, вучэбнай задачы з выкарыстаннем мультымедыйных тэхналогій. | Тэматыка прэзентацый адлюстравана ў табліцы «Патрабаванні да выканання самастойнай працы студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне» і ў Прыкладнай тэматыцы дакладаў, рэфератаў і прэзентацый. |
| 4 | Тэст | Сістэма фармалізаваных заданняў, па выніках выканання якіх можна меркаваць аб узроўні валодання інфармацыяй, аб ведах, уменнях і навыках. | https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=740; https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2133. |

Для кантролю эфектыўнасці арганізацыі самастойнай працы студэнтаў можна праводзіць анкетаванне, падчас якога выяўляецца карыснасць тых ці іншых відаў і арганізацыйных формаў самастойнай працы, правільнасць і своечасовасць іх уключэння ў навучальны працэс, дастатковасць метадычнага забеспячэння, адпаведнасць запланаванага часу на іх выкананне і г. д.

Крытэрыямі адзнакі вынікаў самастойнай працы студэнта могуць з’яўляцца:

– узровень засваення студэнтам вучэбнага матэрыялу;

– уменне студэнта выкарыстоўваць тэарэтычныя веды пры выкананні практычных задач;

– абгрунтаванасць і выразнасць выкладу адказу;

– афармленне матэрыялу ў адпаведнасці з патрабаваннямі стандартаў;

– сфарміраваныя ўменні і навыкі ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі вывучэння дысцыпліны.

Самастойная праца студэнтаў можа быць паспяховай толькі ў выпадку яе правільнай арганізацыі, неабходнага метадычнага суправаджэння, дзейснага кантролю, абавязковай сістэматызацыі, а пры неабходнасці і карэкцыі ведаў, атрыманых студэнтамі самастойна.

# ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ “РЫТОРЫКА І КУЛЬТУРА БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ”

## дзённая форма атрымання адукацыі

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | Коль-касць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканан-ня |
|---|---|---|---|---|
| 2 | Прамоўніцкае мастацтва старажытнай Грэцыі. Красамоўства ў старажытным Рыме. Развіццё рыторыкі ў сярэднія стагоддзі. | 2 | Падрыхтаваць рэферат аб рыторыцы ў старажытным Грэцыі і Рыме. | Рэферат |
| 2 | Тэорыі антычнай рыторыкі. | 2 | Падрыхтаваць прэзентацыю аб рыторыцы ў антычнасці. | Прэзента-цыя |
| 2 | Прамоўніцкае мастацтва эпохі Адраджэння і новага часу. Рытарычная думка ва ўсходнеславянскай культуры XVII–XVII стст. | 2 | Падрыхтаваць канспект аб прамоўніцкім мастацтве эпохі Адраджэння і новага часу, рытарычнай думцы ва ўсходнеславянскай культуры XVII–XVII стст. | Канспект |
| 2 | Рытарычная дзейнасць лепшых прамоўцаў Беларусі. | 2 | Падрыхтаваць рэфераты аб рытарычнай дзейнасці лепшых прамоўцаў Беларусі. | Рэферат |
| 3 | Паняцце «топас». Сэнсавыя мадэлі выказвання. | 2 | Падрыхтаваць канспект аб паняцці «топас», сэнсавых мадэлях выказвання. | Канспект |
| 3 | Узаемадзеянне вуснай і пісьмовай форм мовы пры напісанні аратарскага выступлення. | 2 | Падрыхтаваць канспект аб узаемадзеянні вуснай і пісьмовай форм мовы пры напісанні аратарскага выступлення. | Канспект |
| 3 | Культура палемічнай мовы і моўныя сродкі аратара. Падбор альтэрнатыўных, уводных слоў і выразаў. Размежаванне матываваных і нематываваных паўтораў, складанне слоўніка сінонімаў, эпітэтаў. | 4 | Падрыхтаваць рэферат і прэзентацыю на адну з тэм: «Культура палемічнай мовы і моўныя сродкі аратара», «Падбор альтэрнатыўных, уводных слоў і выразаў», «Размежаванне матываваных і нематываваных паўтораў, складанне слоўніка сінонімаў, эпітэтаў» | Рэферат, прэзента-цыя |
| 3 | Прафілактыка «аратарскага шоку». | 2 | Падрыхтаваць даклад на тэму «Прафілактыка “аратарскага шоку” ». | Даклад |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 3 | Рытарычнае пытанне. Віды пабудовы сказаў (інверсія, градацыя, паралелізм, паўтор, перыяд). Выкарыстанне прыказак, прымавак, крылатых выразаў. | 4 | Падрыхтаваць і вымавіць рытарычныя пытанні, сказы з інверсіяй, градацыяй, паралелізмам, паўторамі, перыядам. Падрыхтаваць прамову з прыказкамі, прымаўкамі, крылатымі выразамі. | Прамова, вымаўленне сказаў |
| 3 | Тропы і фігуры маўлення. | 2 | Падрыхтаваць канспект аб тропах і фігурах маўлення, прывесці прыклады. | Канспект |
| 3 | Маўленчае (фанацыйнае) і фізіялагічнае дыханне. | 2 | Падрыхтаваць канспект аб адрозненні маўленчага (фанацыйнага) і фізіялагічнага дыхання, паказаць схематычна. | Канспект |
| 3 | Маўленчы этыкет. | 2 | Падрыхтаваць канспект аб асаблівасцях нацыянальнага маўленчага этыкету. | Канспект |
| 3 | Нацыянальная спецыфіка невербальнай камунікацыі. Імідж. | 2 | Падрыхтаваць канспект аб нацыянальнай спецыфіцы невербальнай камунікацыі, іміджы. | Канспект |
| 3 | Зрокавы аспект выступлення. Знешні від аратара. Размяшчэнне ў аўдыторыі. Погляд. | 4 | Падрыхтаваць прамову з улікам зрокавага аспекту выступлення, знешняга віду аратара, размяшчэння ў аўдыторыі. | Прамова |
| 4 | Рэкламная прамова. Правілы падрыхтоўкі рэкламнай прамовы. | 2 | Падрыхтаваць даклад на тэму «Рэкламная прамова. Правілы падрыхтоўкі рэкламнай прамовы». | Даклад |
| 4 | Камунікатыўная рыторыка. Функцыі камунікацыі. Камунікатыўная кампетэнтнасць. Тыпы суразмоўцаў. | 4 | Падрыхтаваць рэферат і прэзентацыю на тэму «Камунікатыўная рыторыка. Функцыі камунікацыі. Камунікатыўная кампетэнтнасць. Тыпы суразмоўцаў». | Рэферат, прэзентацыя |
| 4 | Эфектыўнасць публічнай прамовы. Эфектыўнасць публічнай прамовы ў розных аўдыторыях. Ацэнка эфектыўнасці публічнай прамовы. | 2 | Падрыхтаваць канспект аб эфектыўнасці публічнай прамовы ў розных аўдыторыях, ацэнцы эфектыўнасці публічнай прамовы. | Канспект |
| 5 | З гісторыі мастацтва спрэчкі. | 2 | Падрыхтаваць канспект аб гісторыі мастацтва спрэчкі. | Канспект |
| 5 | Дыспут. Правілы правядзення арганізаванага дыспуту. Палеміка. | 4 | Падрыхтавацца да правядзенне дыспуту і палемікі. | Дыспут, палеміка |
| 5 | Мастацтва адказваць на пытанні. Віды адказаў. | 4 | Падрыхтаваць рэферат на тэму "Мастацтва адказваць на пытанні. Віды адказаў". | Рэферат |
| | **Усяго** | **52** | | |

# ПЕРАЛІК СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ, ЯКІЯ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Для атрымання аб’ектыўнай інфармацыі аб узроўні паспяховасці студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Рыторыка і культура беларускага маўлення” мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: апераджальны, бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю выкарыстоўваецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

З мэтай выніковай дыягностыкі якасці засваення тэарэтычнага і практычнага матэрыялу студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Рыторыка і культура беларускага маўлення” вучэбным планам прадугледжана правядзенне кантрольных работ рознага віду. Пры падборы заданняў улічваецца аб’ём тэарэтычных звестак па пэўнай тэме, індывідуальны ўзровень падрыхтоўкі навучэнцаў і інш.

Апераджальная, бягучая і прамежкавая дыягностыка кампетэнцый па вучэбнай дысцыпліне “Рыторыка і культура беларускага маўлення” можа мець розныя формы, сярод якіх:

– вусны кантроль: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках;

– пісьмовы кантроль: тэрміналагічныя дыктанты, дыктанты з дадатковымі заданнямі, пісьмовыя работы па аўдыторных (дамашніх) практыкаваннях, рэфераты;

– графічны кантроль: моўны разбор з дапамогай графічных сродкаў, графічны дыктант (запаўненне табліцы па пэўнай тэме);

– тэставы кантроль (у тым ліку ў СДН MOODLE: https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=740; https://bspu.by/moodle/course/view.php?id=2133): выкананне тэставых заданняў адкрытага і закрытага тыпу.

Для дыягностыкі кампетэнцый, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў на прамежкавым і выніковым этапах рэкамендуецца выкарыстоўваць тэсты і тэставыя заданні, рознаўзроўневыя кантрольныя заданні. Рэкамендаваная выніковая форма кантролю – залік.

# ПРЫКЛАДНЫЯ ПЫТАННІ ДА ЗАЛІКУ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “РЫТОРЫКА І КУЛЬТУРА БЕЛАРУСКАГА МАЎЛЕННЯ”
**дзённая форма атрымання адукацыі**

1. Прадмет і задачы курса, яго месца ў сістэме лінгвістычных дысцыплін і гуманітарнай адукацыі. Рыторыка як мастацтва і яе значэнне ў жыцці чалавека.
2. Вызначэнне, прадмет і задачы рыторыкі. Сувязь рыторыкі з іншымі навукамі. Асноўныя тэрміны і паняцці курса.
3. Прамоўніцкае мастацтва старажытнай Грэцыі.
4. Красамоўства ў старажытным Рыме.
5. Развіццё рыторыкі ў сярэднія стагоддзі.
6. Тэорыі антычнай рыторыкі.
7. Прамоўніцкае мастацтва эпохі Адраджэння і новага часу.
8. Рытарычная думка ва ўсходнеславянскай культуры XVII–XVII стст.
9. Рыторыка ў Беларусі.
10. Спецыфіка вуснага публічнага выступлення. Віды публічных выступленняў.
11. Рытарычныя законы.
12. Працэс падрыхтоўкі публічнага выступлення.
13. Рытарычная дзейнасць на этапе падрыхтоўкі прамовы. Тэма выступлення. Мэтавая ўстаноўка маўлення. Адбор і сістэматызацыя матэрыялу.
14. Паняцце «топас». Сэнсавыя мадэлі выказвання.
15. Узаемадзеянне вуснай і пісьмовай форм мовы пры напісанні аратарскага выступлення.
16. Працэс падрыхтоўкі публічнага выступлення. Рытарычная дзейнасць на этапе размяшчэння матэрыялу.
17. Віды ўступаў і заключэнняў, прыёмы іх канструявання.
18. Спосабы разгортвання асноўнай часткі прамовы.
19. Культура палемічнай мовы і моўныя сродкі аратара. Падбор альтэрнатыўных, уводных слоў і выразаў.
20. Рытарычная дзейнасць на этапе слоўнага афармлення выступлення. Тактыкі маўленчага ўздзеяння. Тропы і фігуры маўлення.
21. Рытарычная дзейнасць на этапе запамінання. Прыёмы запамінання інфармацыі.
22. Прафесійнае майстэрства аратара. Выступленне з прамовай. Узаемадзеянне аратара з аўдыторыяй.
23. Прафілактыка «аратарскага шоку».
24. Рытарычнае пытанне. Віды пабудовы сказаў (інверсія, градацыя, паралелізм, паўтор, перыяд). Выкарыстанне прыказак, прымавак, крылатых выразаў.
25. Паняцце «тэхнікі маўлення». Інтанацыя. Голас. Дыкцыя.
26. Невербальныя сродкі ў маўленні. Маўленчы этыкет.
27. Нацыянальная спецыфіка невербальнай камунікацыі. Імідж.

28. Паняцце аб маўленчым уздзеянні. Маўленчае маніпуляванне.

29. Кагнітыўныя механізмы маўленчага уздзеяння. Камунікатыўныя стратэгіі і іх рэалізацыя ў маўленні.

30. Зрокавы аспект выступлення. Знешні від аратара. Размяшчэнне ў аўдыторыі. Погляд.

31. Камунікатыўныя якасці маўлення як умова эфектыўных зносін.

32. Інфармацыйная прамова.

33. Пераконваючая прамова. Кампазіцыя і жанры маўленчых твораў.

34. Рэкламная прамова. Правілы падрыхтоўкі рэкламнай прамовы.

35. Маналагічнае і дыялагічнае маўленне. Дыскусійная маўленне.

36. Прамова, заклікаючая да дзеяння. Лагічныя прыёмы. Доказ і перакананне.

37. Натхняльная прамова. Ваенна-патрыятычныя выступленні, віншавальныя і прывітальныя прамовы.

38. Забаўляльная прамова. Давяральная прамова.

39. Камунікатыўная рыторыка. Функцыі камунікацыі.

40. Камунікатыўная кампетэнтнасць. Тыпы суразмоўцаў.

41. Эфектыўнасць публічнай прамовы ў розных аўдыторыях. Ацэнка эфектыўнасці публічнай прамовы.

42. Фактары пераконваючага ўздзеяння. Аргументацыя: мэты, структура і яе віды.

43. Суб’ект і аб’ект аргументацыі. Фактары, якія вызначаюць пераканаўчасць маўлення.

44. Тэза. Антытэза. Тыпы аргументацыйных прамоў. Класічная канцэпцыя працэсу пераканання.

45. Абвяржэнне аргументацыі. Нагнятанне аргументаў. Метад Сакрата.

46. Тыпы аргументацыйных прамоў па іх пабудове. Доказ і перакананне.

47. З гісторыі мастацтва спрэчкі.

48. Структура спрэчкі. Віды спрэчак па мэтах і сродках.

49. Дыспут. Правілы правядзення арганізаванага дыспуту. Палеміка.

50. Функцыі пытанняў у аргументацыі. Структура пытанняў.

51. Віды пытанняў. Паняцце карэктнасці пытанняў.

52. Мастацтва адказваць на пытанні. Віды адказаў.

## КРЫТЭРЫ АЦЭНКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ
## (прамежкавая атэстацыя)

Вынікі прамежкавай атэстацыі навучэнцаў у форме заліку ацэньваюцца адзнакамі “залічана”, “не залічана”.

“Залічана” – поўная, дакладная характарыстыка навуковай тэрміналогіі па вывучаным курсе; ўменне прывесці прыклады ў адпаведнасці з праслуханым лекцыйным курсам; ўменне самастойна прааналізаваць паняцці і з'явы, прапанаваныя для разгляду ў ходзе заліку; здольнасць пераносіць тэарэтычныя веды ў сферу практычнай дзейнасці.

“Не залічана” – студэнт не валодае навуковай тэрміналогіяй па вывучаным курсе, не можа адказаць на пытанні і прывесці прыклады па вывучаных тэмах, не можа перанесці атрыманыя тэарэтычныя веды ў сферу практычнай дзейнасці.

**ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ**

| Назва дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб змяненнях у змесце вучэбнай праграмы па вывучаемай вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| 1. «Фанетыка-лексіка-словаўтварэнне»,<br>2. «Марфалогія»,<br>3. «Сінтаксіс»,<br>4. «Культура маўлення педагога»,<br>5. «Стылістыка»,<br>6. «Тэкст. Чужое маўленне. Пунктуацыя». | Кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Прапаноў аб змене вучэбнай праграмы няма | Лічыць праграму ўзгодненай з вучэбнымі дысцыплінамі (пратакол № 11 ад 20.06.2024 г.) |